# § 15. Рэкрэацыйныя рэсурсы

***Узгадваем.*** *Якія прыродныя і гісторыка-культурныя аб'екты выкарыстоўваюцца для адпачынку? Дзе і чаму размяшчаюцца сусветныя турысцкія цэнтры і курорты?*

**Віды рэкрэацыйных рэсурсаў.** Да *рэкрэацыйных* (ад лац. *recreatio* — 'аднаўленне') *рэсурсаў* адносяцца прыродныя і культурна-гістарычныя комплексы, унікальныя сацыяльна-гаспадарчыя аб'екты, якія выкарыстоўваюцца або могуць выкарыстоўвацца для арганізацыі адпачынку і аздараўлення людзей, для экскурсій і турызму. Гэта маляўнічыя ландшафты, лясныя масівы, рэкі і азёры. Не менш важныя аб'екты гістарычнай спадчыны: старажытныя замкі, цэрквы і касцёлы, музеі.

Выкарыстанне рэкрэацыйных рэсурсаў залежыць ад прыродных умоў, перш за ўсё *клімату*. Найбольш камфортны клімат для летняга адпачынку — у паўднёвых раёнах Беларусі, а для зімовага — на поўначы і ў цэнтральнай частцы краіны. Важную ролю ў ацэнцы рэкрэацыйных рэсурсаў адыгрывае *рэльеф*. Узгорысты рэльеф Беларускай грады спрыяе развіццю лыжнага спорту. Аптымальнымі для адпачынку ў Беларусі лічацца хваёвыя і шыракаліста-хваёвыя *лясы*. Азёры, вадасховішчы, рэкі, каналы далучаны да воднага турызму, які ўключае рыбную лоўлю, сплавы на лодках, плаванне.



Мал. 68. Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс

Да рэкрэацыйных рэсурсаў пазнавальнага характару адносяцца помнікі гісторыі і архітэктуры. Агульная колькасць гісторыка-культурных аб'ектаў нацыянальнага значэння ў Беларусі перавышае 14 тысяч. *Назавіце аб'екты, якія можна аднесці да гісторыка-культурных.* Найбольш вядомыя помнікі — Мірскі замкавы і Нясвіжскі палацава-паркавы комплексы, уключаныя ЮНЕСКА ў спіс Сусветнай спадчыны (мал. 68). Шмат у краіне помнікаў, мемарыяльных комплексаў, звязаных з падзеямі войнаў. Найбольш вядомыя з іх «Брэсцкая крэпасць-герой», «Хатынь» і інш.

Рэкрэацыйныя рэсурсы бываюць *курортнымі*, *аздараўленчымі*, *спартыўнымі* і *экскурсійна-турысцкімі*. Але часцей за ўсё тэрыторыі выконваюць адначасова некалькі функцый.

**Зоны адпачынку і курорты.** Важную ролю ў аднаўленні і ўмацаванні здароўя адыгрываюць **зоны адпачынку**. Вакол гарадоў вылучаюцца тэрыторыі са спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для размяшчэння рэкрэацыйных аб'ектаў. Яны адносяцца да *зон адпачынку мясцовага значэння*.

Зараз вылучаецца амаль 200 зон адпачынку мясцовага значэння. Усяго ў іх могуць адначасова адпачываць больш за 3 млн чалавек.

**Зона адпачынку** — тэрыторыя са спрыяльнымі прыроднымі ўмовамі для размяшчэння рэкрэацыйных аб'ектаў (санаторыяў, аздараўленчых лагераў, прафілакторыяў і г. д.) і арганізацыі адпачынку насельніцтва.

У лясных масівах, на берагах рэк, азёр і вадасховішчаў размешчаны *зоны адпачынку рэспубліканскага значэння*. У Беларусі 15 такіх тэрыторый: «Мінскае мора», «Браслаўскія азёры», «Стоўбцы», «Вілейка» і інш. У іх адначасова могуць адпачываць каля 400 тыс. чалавек. У прыгараднай зоне Мінска, на берагах вадасховішчаў Заслаўскае, Крыніца, Дразды размешчана зона адпачынку «Мінскае мора». Адначасова ў ёй могуць адпачываць 150 тыс. чалавек (мал. 69). На паўночным захадзе краіны створана зона адпачынку «Браслаўскія азёры». Маляўнічыя азёры, хваёвыя лясы на іх берагах абумовілі стварэнне больш чым 10 баз адпачынку і турысцкіх комплексаў (мал. 70). Буйная зона адпачынку «Вілейка» размешчана на пакрытых хваёвымі лясамі берагах Вілейскага вадасховішча. На берагах Нёмана знаходзіцца зона адпачынку «Стоўбцы» з турысцкім комплексам «Высокі бераг» і Коласаўскім заказнікам.



Мал. 69. Зона адпачынку «Мінскае мора»

Самыя багатыя рэкрэацыйнымі рэсурсамі тэрыторыі вылучаюцца ў якасці *курортных зон* і *лячэбна-аздараўленчых мясцовасцей*. У Беларусі зараз адна зона і 11 курортаў рэспубліканскага і мясцовага значэння, спрыяльных для адпачынку і лячэння. У межах курортаў Беларусі дзейнічае



Мал. 70. Зона адпачынку «Браслаўскія азёры»

больш за 100 санаторыяў і аздараўленчых цэнтраў. Найстарэйшы ў краіне кліматабальнеалагічны курорт «Ждановічы» размешчаны ў зоне адпачынку «Мінскае мора». Уключае некалькі санаторыяў («Крыніца», «Пралеска» і інш.), дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ждановічы» і інш. Самай вядомай у краіне з'яўляецца курортная зона Нарачанскага рэгіёна (мал. 71). Вакол возера размяшчаюцца санаторыі, дамы адпачынку, гасцінічныя комплексы. Асобныя санаторыі размешчаны па-за курортамі: «Іслач», «Белая Вежа», «Азёрны», «Баравое» і інш.



Мал. 71. Курорт «Нарач»

На карце атласа (с. 28) знайдзіце курорты рэспубліканскага і мясцовага значэння.

**Турысцкія комплексы і маршруты.** Багатая культурна-гістарычная спадчына Беларусі і прыгажосць ландшафтаў сведчаць пра высокі рэкрэацыйны патэнцыял краіны. Зараз у Беларусі арганізацыяй турызму займаюцца такія турысцкія арганізацыі, як «Беларустурыст», «Аўтаматызаваныя тэхналогіі турызму», «Віаполь», «ЦэнтрКурорт» і інш. У Мінску, Брэсце, Гродне, Слоніме, Навагрудку, Полацку, Міры і Нясвіжы дзейнічаюць цэнтры турызму і адпачынку міжнароднага значэння. У многіх гарадах працуюць цэнтры турызму і адпачынку нацыянальнага і мясцовага значэння.

Знайдзіце на карце атласа (с. 28) цэнтры турызму і адпачынку міжнароднага значэння.

У зонах адпачынку размешчаны **турысцкія комплексы** і базы адпачынку.

**Турысцкі комплекс** — рэкрэацыйны аб'ект, які забяспечвае арганізацыю пражывання, харчавання і аздараўлення турыстаў.

На беразе возера Лосвіда (у 30 км ад Віцебска) размешчаны турысцкі комплекс «Лосвіда», недалёка ад Гродна — агратурыстычны комплекс «Каробчыцы», у межах нацыянальнага парку «Прыпяцкі» — туркомплекс «Над Прыпяццю». Шмат іх і ў іншых рэгіёнах Беларусі.

Турысцкія прадпрыемствы арганізуюць турысцка-экскурсійныя маршруты па цікавых у прыродным ці гісторыка-культурным дачыненні мясцінах краіны. З захаду на ўсход (ад Брэста да Оршы) Беларусь перасякаюць аўтамабільная дарога і чыгунка. Гэтыя магістралі вобразна называюць «беларускім экватарам». У іх зоне знаходзяцца гарады і пасёлкі з гістарычнымі помнікамі (Косава, Ружаны, Мір, Нясвіж, Заслаўе, Барысаў і інш.). Найбольш вядомымі турысцка-экскурсійнымі маршрутамі з'яўляюцца: Мінск — Мір — Нясвіж, Мінск — Слонім — Жыровічы, Мінск —

Навагрудак — Бярозаўка — Ліда, Мінск — Полацк, Мінск — Хатынь, Брэст — Камянюкі (у Белавежскую пушчу) і інш.

**Перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў.** Рэкрэацыйныя рэсурсы Беларусі выкарыстоўваюцца не ў поўнай меры. Асабліва гэта тычыцца арганізацыі міжнароднага турызму. У цяперашні час у Беларусі прынята дзяржаўная праграма развіцця турызму, якая прадугледжвае бязвізавы рэжым. Паспяхова праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы: чэмпіянаты свету і Еўропы, Еўрапейскія гульні і іншыя мерапрыемствы, якія спрыяюць развіццю турызму. Пашыраецца трансгранічнае супрацоўніцтва ў турызме, прыкладам якога з'яўляецца Аўгустоўскі канал.

Шматлікія музеі, замкі, помнікі дойлідства, прыродныя аб'екты прывабныя для замежных турыстаў. Беларусь можа стаць адным з цэнтраў міжнароднага турызму ва Усходняй Еўропе. Што неабходна зрабіць для больш паспяховага выкарыстання турысцкага патэнцыялу краіны?

У апошнія гады ў Беларусі пачаў актыўна развівацца экалагічны і сельскі турызм. Створаны, напрыклад, музей старадаўніх народных рамёстваў «Дудуткі» (мал. 72). Практычна ва ўсіх раёнах краіны паспяхова функцыянуе каля 2 тыс. аграсядзіб, якія аказваюць турысцкія паслугі насельніцтву. У лясгасах арганізуецца паляванне для замежных турыстаў, створаны вальеры. У межах нацыянальных паркаў распрацаваны пешыя і водныя экалагічныя маршруты. Уздоўж прыродных зялёных калідораў, далін рэк, гістарычных гандлёвых шляхоў і старых чыгунак ствараюцца *зялёныя маршруты*, напрыклад «Воднымі маршрутамі Вялікага Княства Літоўскага».



Мал. 72. Музей старадаўніх народных рамёстваў «Дудуткі»

Вялікую папулярнасць набывае спартыўны турызм. У апошнія гады ў Беларусі актыўна развіваецца інфраструктура спартыўных збудаванняў, праводзяцца спартыўныя спаборніцтвы рознага ўзроўню: чэмпіянаты Еўропы па фігурным катанні і біятлоне, чэмпіянаты свету па акадэмічным веславанні і хакеі, II Еўрапейскія гульні і інш.

**Абагульнім і запомнім.** Беларусь забяспечана рэкрэацыйнымі рэсурсамі: курортнымі, аздараўленчымі і экскурсійна-турысцкімі.

У краіне каля 200 зон адпачынку мясцовага і 15 зон адпачынку рэспубліканскага значэння, 11 курортаў рэспубліканскага і мясцовага значэння.

1. На якія віды падзяляюцца рэкрэацыйныя рэсурсы? 2. Дзе размешчаны зоны адпачынку і курорты ў межах Беларусі? 3. У якім рэгіёне Беларусі і чаму засяроджана найбольшая колькасць зон адпачынку рэспубліканскага значэння?

4. Якія турысцкія маршруты карыстаюцца найбольшым попытам у Беларусі і чаму? 5. Чаму ў цяперашні час рэкрэацыйны патэнцыял паўднёвых раёнаў краіны саступае паўночным?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Вызначце перспектывы выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў у вашым раёне. 2. Прапануйце турысцкія маршруты па вашым рэгіёне для замежных гасцей.

## § 16. Геаэкалагічныя праблемы

***Узгадваем.*** *Чаму гаспадарчая дзейнасць можа прывесці да геаэкалагічных праблем? Пра якія глабальныя геаэкалагічныя праблемы вы чулі з СМІ?*

**Сутнасць геаэкалагічных праблем.** Пад *прыродна-рэсурсным патэнцыялам* разумеецца сукупнасць прыродных рэсурсаў, якія можна выкарыстоўваць без пагаршэння стану ландшафтаў. Яго выкарыстанне можа прыводзіць да геаэкалагічных праблем. Напрыклад, здабыча карысных выкапняў можа прывесці да забруджвання глеб, вод, паветра і г. д. Рацыянальнае прыродакарыстанне забяспечвае найбольш поўнае выкарыстанне прыродна-рэсурснага патэнцыялу. Экалагічны складнік з’яўляецца важным паказчыкам рацыянальнага прыродакарыстання ў адпаведнасці з Нацыянальнай стратэгіяй устойлівага развіцця краіны. На сучасным этапе будаўніцтва прамысловых прадпрыемстваў, дарог асваенне карысных выкапняў, правядзенне меліярацыі немагчыма без экалагічнай экспертызы.

Уздзеянне чалавека на прыроду прывяло да ўзнікнення геаэкалагічных праблем, самымі вострымі з якіх з’яўляюцца: радыеактыўнае забруджванне тэрыторыі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС, дэградацыя ландшафтаў Палесся пад уплывам асушэння, дэградацыя навакольнага асяроддзя ў Салігорскім горнапрамысловым раёне. Для вырашэння гэтых праблем неабходна правядзенне комплексу спецыяльных мерапрыемстваў.

**Забруджванне тэрыторыі радыенуклідамі.** У красавіку 1986 г. адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС. Гэта самая буйная тэхнагенная аварыя за ўсю гісторыю выкарыстання атамнай энергіі. Амаль 70 % радыеактыўных выкідаў прыйшлося на Беларусь. Вялікая тэрыторыя была забруджана ізатопамі ёду, цэзію, стронцыю, плутонію. Беларусь была аб’яўлена зонай экалагічнага бедства і атрымала статус экалагічна неспрыяльнай тэрыторыі. Забруджванне ёдам-131 у цяперашні час не назіраецца, але ў першыя дні пасля аварыі ахоплівала ўсю тэрыторыю краіны.